# ФАКТЫ І ЛІЧБЫ ПРА АДНОСІНЫ ЕС І БЕЛАРУСІ

#eapsummit

**На працягу апошніх двух гадоў назіраецца прагрэс у адносінах ЕС і Беларусі. Беларусь больш актыўна ўдзельнічае ва Усходнім партнёрстве, у прыватнасці ў шматбаковых фарматах. Зробленыя Беларуссю істотныя крокі ў сферы павагі ўніверсальных свабод, вяршэнства права і правоў чалавека, у тым ліку фундаментальных працоўных правоў, застануцца асноватворнымі крытэрыямі пры фармаванні будучай палітыкі ЕС у дачыненні да Беларусі. ЕС лічыць, што працэс далучэння да СГА мусіць быць прыярытэтным ў парадку дня. Уступленне Беларусі ў СГА будзе спрыяць стварэнню больш прадказальнага і стабільнага бізнес-асяроддзя ў краіне, што з'яўляецца неабходнай умовай для прыцягнення інвестараў і дыверсіфікацыі беларускай эканомікі.**

## БОЛЬШ МОЦНАЯ ЭКАНОМІКА

ЕС адмяніў большасць абмежавальных мераў у дачыненні да Беларусі ў лютым 2016 года, адначасова актывуючы ключавы пакет эканамічных і іншых крокаў, звязаных з супрацоўніцтвам. Пакет уключае ў сябе:

✓ супрацоўніцтва з міжнароднымі фінансавымі інстытутамі, такімі як Еўрапейскі інвестыцыйны банк (ЕІБ) і Еўрапейскі банк рэканструкцыі і развіцця (ЕБРР);

✓ узмоцненая падрыхтоўка да далучэння да Сусветнай гандлёвай арганізацыі (СГА);

✓ адмена квот на экспарт тэкстылю.

Праграма па спрыянні росту прыватнай ініцыятывы ў Беларусі (SPRING) падтрымлівае прыватныя мясцовыя эканамічныя ініцыятывы і стварэнне працоўных месцаў у Беларусі.

## ПАВЫШЭННЕ ЭФЕКТЫЎНАСЦІ КІРАВАННЯ

✓ На ўзроўні высокіх службовых асоб была створана Каардынацыйная група ЕС-Беларусь. Гэта форум для дыялогу па пытаннях палітыкі, вызначэння накірункаў супрацоўніцтва паміж ЕС і Беларуссю і адсочвання далейшага развіцця адносін.

✓ ЕС аказвае тэхнічную дапамогу Беларусі ў падрыхтоўцы да ўступлення ў СГА з дапамогай інструмента прамога двухбаковага супрацоўніцтва TAIEX.

✓ Двойчы на год адбываецца афіцыйны дыялог ЕС-Беларусь па гандлі з мэтай рэгулярнага абмену думкамі, у тым ліку адносна ўнутранага рэгулявання рынку і іншых пытанняў, звязаных з гандлем.

✓ Быў распачаты Мытны дыялог паміж ЕС і Беларуссю. Ён накіраваны на выяўленне магчымасцей супрацоўніцтва і аказання дапамогі, каб спрыяць развіццю гандлю, гарантаваць бяспеку паставак, змагацца з махлярствам.

## БОЛЬШ МОЦНАЯ ЎЗАЕМАСУВЯЗЬ

✓ У чэрвені 2017 года Беларусь далучылася да Усходнееўрапейскага партнёрства па пытаннях энергаэфектыўнасці і навакольнага асяроддзя (E5P). Гэта мэтавы фонд, які кіруе ЕБРР. Ён выдае пазыкі для муніцыпальных праектаў па энергаэфектыўнасці і навакольным асяроддзі ў краінах Усходняга партнёрства.

✓ Беларусь мае адны з найлепшых вынікаў сярод краін Усходняга партнёрства ў рамках праграмы Гарызонт 2020 па даследаваннях і інавацыях.

## БОЛЬШ МОЦНАЕ ГРАМАДСТВА

✓ Прадстаўнікам улады Беларусі ўсіх узроўняў ЕС рэгулярна ўздымае пытанні правоў чалавека, уключаючы свабоду сходаў і асацыяцыі, фундаментальных працоўных правоў, свабоды слова і сродкаў масавай інфармацыі.

✓ У аснове Беларускага Нацыянальнага плана дзеянняў па правах чалавека, прынятага у кастрычніку 2016 года, ляжыць працэс ўнутраных рэформаў і заканадаўчых змен.

✓ Былі скончаныя перамовы па Партнёрстве ў сферы мабільнасці і вядуцца перамовы па Дамовах аб спрашчэнні візавага рэжыму і рэадмісіі.

✓ Праграма «Эразмус+» дала магчымасць амаль 1000 студэнтаў і выкладчыкаў з Беларусі вучыцца або выкладаць у краінах ЕС у перыяд з 2015 па 2017.

✓ Больш за 2300 прадстаўнікоў моладзі і супрацоўнікаў моладзевых арганізацый з Беларусі бралі ўдзел у абменах, валанцёрстве і праектах па нарошчванні патэнцыялу.

## У ЛІЧБАХ

**1/3**

ЕС – 2-гі гандлёвы партнёр Беларусі з доляй у амаль 1/3.

**91,5млн**

У 2014-2017 пакет дапамогі Беларусі з боку ЕС у рамках Еўрапейскага інструмента суседства склаў 91,5 млн. еўра.

## ЯДЗЕРНАЯ БЯСПЕКА

Захаванне высокіх стандартаў ядзернай бяспекі з'яўляецца ключавым прыярытэтам для ЕС, тым больш, што АЭС у Беларусі будуецца так блізка да мяжы ЕС (у Астраўцы). Для Еўрапейскага саюза важна, каб ядзерная бяспека забяспечвалася і за яго межамі, Беларусі варта канструктыўна супрацоўнічаць з адпаведнымі міжнароднымі органамі.

## АДМЕНА СМЯРОТНАГА ПАКАРАННЯ

Беларусь з'яўляецца адзінай краінай у Еўропе, дзе ўсё яшчэ прымяняецца смяротнае пакаранне. На дадзены момант чатыры чалавекі ў Беларусі чакаюць выканання смяротнага прыгавору. Прадстаўнікам улады Беларусі ўсіх узроўняў ЕС рэгулярна ўздымае пытанні правоў чалавека, уключаючы смяротнае пакаранне. Зробленыя смяротныя выракі павінны быць замененыя, павінен быць уведзены мараторый ў якасці першага кроку да адмены смяротнага пакарання.

EaP | Eastern Partnership